УДК 908.94

# РАЗВІЦЦЁ ГАНДЛЮ Ў ВАЎКАВЫСКІМ ПАВЕЦЕ Ў XIX – ПАЧАТКУ XX СТСТ

***Наталля Насевіч***
*Гродно, Беларусь*

У дадзеным артыкуле разгледжаны праблемы развіцця гандлю ў Ваўкавыскім павеце ў XIX – пачатку XX стст., прааналізаваны характэрныя асаблівасці і тэндэнцыі гандлёвых зносін. Выяўлена, што гандаль развіваўся пераважна ў форме кірмашоў. На аснове праведзенага аўтарам даследавання відавочна, што развіццё гандлю ў Ваўкавыскім павеце было цесна звязана са станам прамысловасці, сельскай гаспадаркі, плацежаздольнасці насельніцтва.

***Ключавыя словы: гандаль, Ваўкавыскі павет, кірмаш, капітал, экспарт, імпарт, тавараабарот, купцы, шляхі зносін***

Гандаль займае значную частку эканамічнага развіцця Беларусі, пачынаючы з часоў ВКЛ, калі рынкі станавіліся цэнтрамі гарадоў. Да пачатку XIX ст., у Ваўкавыскім павеце, дзе гандаль ажыццяўляўся або рамеснікамі і звязанымі з імі яўрэямі, або самімі сялянамі. Відавочна, што развіццё гандлю паслужыла найважнейшай умовай росту не толькі прамысловай вытворчасці, але і сельскай гаспадаркі. Разам з тым роля і значнасць гандлю ў гістарычным кантэксце ўвесь час змяняліся.

Паралельна з развіццём капіталізму адбываецца паступовае зніжэнне палітычнага кантролю над эканомікай. Як следства, павялічваецца аб'ём гандлю па нерэгуляваных цэнах, прыбытак, які фарміруе новы клас купцоў, асновай іх дзейнасці становіцца купля-продаж розных тавараў. Па меры развіцця капіталізму купцы ўключалі ў тавараабарот усё большую колькасць тавараў і ўсё большую тэрыторыю [3, с. 279].

Даследаванні паказваюць, што апераджальны рост гандлю і расшырэнне рынкаў аказваюць значны ўплыў на эканамічнае развіццё рэгіёнаў і цэлых дзяржаў. У шэрагу выпадкаў уплыў гандлю становіцца больш істотным, чым рост аб'ёмаў вытворчасці, а інавацыі ў сельскай гаспадарцы і прамысловасці часцяком з'яўляюцца прамым следствам патрабаванняў нарастаючага гандлю.

Меркай эканамічнай «дэмакратыі» быў рынак. Менавіта ён здымаў саслоўныя абмежаванні вытворцаў і называў рэальную цану іх эканамічным намаганням. Унутраны рынак Ваўкавыскага павету ўключаў у сябе гарадскі і не менш значны местачковы гандаль.

Полесгу

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі да пачатку XIX ст. пачаў фарміравацца клас прафесійных купцоў. Асаблівасцю купецкага саслоўя ў Ваўкавыскім павеце было тое, што асноўную яго масу складалі яўрэі.

Цэны, якія яны выстаўляюць, прыводзяць да збяднення народа. Асабліва гэта прыкметна пры продажы лесу, калі памешчыкі часцяком аказваліся ў стратах. Аднак нягледзячы на ўсе гэтыя праблемы гандаль у Гродзенскай губерні быў дастаткова развіты [3, с. 287].

Галоўнымі прадметамі знешняга і ўнутранага гандлю Ваўкавыскага павету быў будаўнічы лес і соль, якія сплаўлялі па рэках ў г. Гродна і далей у г. Кенігсберг. Лес прадавалі мясцовыя памешчыкі, а таксама дзяржава шляхам высечкі дрэў у Белавежскай пушчы і іншых лясных масівах павета [3, с. 288].

Акрамя таго на мясцовых кірмашах прадаваліся разнастайныя напоі, рыба, ільняное і канаплянае насенне, дробная хатняя жывёла, лес на дровы; мануфактурныя вырабы прадаюцца ў асноўным мясцовай вытворчасці (розны гліняны і драўляны посуд, смала, дзёгаць, драўняны вугаль).

Тавары сельскай гаспадаркі прадстаўлены збожжам, хлебнымі вырабамі, воўнай-сырцом, невялікай колькасцю лёну [4, с. 121].

Асноўнай формай гандлю ў дарэформены час на тэрыторыі Ваўкавыскага павету былі кірмашы. Усяго такіх мелася больш за пятнаццаць, аднак самыя буйныя праводзіліся ў мястэчку Зэльва, канфіскаваным у князя Сапегі, які меў назву Ганненскі. Пачынаўся кірмаш 25 ліпеня і працягваўся цэлы месяц. На ім галоўнымі прадметамі гандлю былі розныя тавары, якія паступалі з Гродзенскай губерні, Царства Польскага, Прусіі і цэнтральных губерняў Расіі.

Акрамя таго, пачынаючы з сярэдзіны 30-х гадоў XIX ст. тут актыўна гандлявалі і коньмі. У 1839 г. розных тавараў было прывезена на 433 429 рублёў, у тым ліку коней на 6 074 рублі; прададзена тавараў і коней на суму 211 595 рублёў срэбрам. Ад найму лавак, лугоў і дамоў атрымана ў даход казны 4 537 рублёў 7 капеек, жыхары мястэчка атрымалі даход памерам 240 рублёў срэбрам.

Другі кірмаш праводзіўся ў канфіскаваным у графа Тышкевіча мястэчку Свіслач (насіў назву Успенскі). Гандляваць сюды з’язджаліся купцы з розных краін свету: Расіі, Украіны, Аўстрыі, Прусіі, Францыі, Даніі, Турцыі, Польшчы. Усяго збіралася да трох-чатырох тысяч чалавек [5]. Пачынаўся 25 жніўня і працягваўся да 25 верасня. Па многіх паказчыках дадзены кірмаш з'яўляецца працягам Ганненскага. Гандаль вёўся фактычна тымі ж таварамі. Таго і іншага прывезена і прыведзена на суму 100 300 рублёў, а прададзена на 36 423 рублёў срэбрам. Казна за наём лавак атрымала 650 рублёў, а жыхары 240 рублёў срэбрам [6, с. 221].

На тэрыторыі Ваўкавыскага павету праводзіліся і аднадзённыя кірмашы. Так, у мястэчку Воўпа 1 мая («У дзень ушэсця») тавараў прывезена на суму 500 рублёў, прададзена на 380 рублёў; 9 мая («Мікалаеўскі») прывезена тавару на 450 рублёў, прададзена на 240 рублёў; 29 ліпеня («У дзень Пятра і Паўла») прывезена на 320 рублёў, прададзена на 150 рублёў; 1 верасня («Пятионка») прывезена на 680 рублёў, прададзена на 570 рублёў гэтыя ярмаркі маюць мала агульнага з класічнымі і хутчэй падобныя на звычайныя кірмашы прымеркаваныя да рэлігійных святаў [6, с. 190].

Тым не менш яны былі вельмі папулярныя сярод мясцовага насельніцтва, таму што даюць магчымасць рэалізаваць прадукцыю на месцы. Вельмі часта на такіх кірмашах можна было сустрэць і заезджых купцоў, якія імкнуліся танней скупіць тавары, для далейшага перапродажу. Так, на мясцовым кірмашы ў мястэчку Рось былі заўважаныя купцы з г. Гродна, Беластока і нават Смаленска [3, с. 291].

Для перавозкі тавараў у Ваўкавыскім павеце выкарыстоўваецца наземны і рачны транспарт. Па рэках купцы выкарыстоўвалі віціны або баркі. На маленькіх рачулках для перавозкі грузаў выкарыстоўваліся вялікія лодкі, якія перавозяць да 200 пудоў грузу [3, с. 292].

У Ваўкавыскім павеце па рацэ Рось сплаўлена 14 лясных плытоў, 42 рабочымі на суму 630 рублёў. Аднак з-за плыткіх тутэйшых рэк фактычнае выкарыстанне мелі толькі дзве ракі – гэта Рось і Зяльвянка. Больш распаўсюджаны былі наземныя гандлёвыя шляхі, якія досыць развіты ў павеце. Акрамя кірмашовага гандлю існавалі месцы, дзе жыхары займаліся і незаконным гандлем. У першую чаргу гэта былі махінацыі са спіртным у піцейных дамах і карчмах. Так, у верасні 1815 г. каля м. Ружаны былі затрыманыя шэсць яўрэяў з пяццю падводамі кантрабандных тавараў. Асаблівую актыўнасць у кантрабандным гандлі праяўлялі менавіта яўрэі памежных рэгіёнаў [1, с. 92].

У сакрэтнай «Запісцы аб яўрэях, якія жывуць у Расіі», пададзенай у III Аддзяленне канцылярыі імператара ў 1842 г., гаварылася: «Торговля контрабандными товарами составляет значительную отрасль промышленности евреев, ныне она упала, но весьма далека от того, чтобы быть прекращенной… Правительство несколько раз предписывало удалить евреев от границы, но они находили всегда средства отклонить приведение данного распоряжения висполнение и продолжают проживать преимущественно в тех местах, где представляются большие удобства к продолжению занятий своих. Хитрости в семь случае употребляемые не исчислимы» [6, с. 102].

Менавіта ў гэтай сферы гандлю пракручваліся самыя складаныя афёры, над якімі «ламалі галовы» мясцовыя ўлады. Так, у 1850 г. Гродзенскае губернскае начальства спрабавала разабрацца ў «таямнічай забастоўцы» паміж трымальнікамі акцызнага і чарачнага водкупу: «Акцизные откупщики, хотя не имеют права заниматься ни покупкою, ни продажею вина в чертах своего откупа, но под другим именем привозят вино из других губерний и учреждают свои подвалы, и взяв таким же образом в содержание все казенные корчмы и шинки, учреждают посредством евреев раздробительную продажу на свой счет под чужим именем… Сим способом имеют в руках своих оптовую и раздробительную продажи вина...» [2, с. 125].

Акрамя таго, віно прадавалася меншай крэпасці (замест 25-30 % толькі 18 % крэпасці) і танней, што павялічыла прыбыткі «махинаторов» за кошт большай распродажы віна і абароту капіталаў. Хоць механізм гэтых злоўжыванняў зразумелы, аднак, следчым давялося канстатаваць: «…при хорошо обдуманной и устроенной стачке нет возможности уличить виновных формальным следствием» [7, с. 126].

У пачатку XIX ст. і фактычна да яго сярэдзіны асноўнай формай гандлю з'яўляўся кірмаш, прычым на тэрыторыі Беларусі гэтая форма развівалася у мястэчках (невялікіх населеных пунктаў). Прычынай такога дызбалансу магла быць забарона яўрэям сяліцца ў гарадах. А ў Беларусі асноўным пасрэдніцкім звяном паміж прадаўцом і пакупніком былі менавіта яўрэі. У Ваўкавыскім павеце было 15 зарэгістраваных купцоў трэцяй гільдыі і ўсе яны былі яўрэямі [3, с. 12]. Акрамя таго местачковы гандаль быў надзвычай выгадны для сялян, якія маглі не адрывацца ад сельскагаспадарчых работ.

Такім чынам, неабходна адзначыць, што развіццё суконнай вытворчасці адбывалася значна хутчэй, чым іншых галін мануфактурнай вытворчасці ў горадзе. Гэтаму спрыяла тое, што суконная мануфактура не патрабавала значных грашовых сродкаў на этапе станаўлення; неабходную сыравіну можна было купіць на месцы ў памешчыкаў; збыт прадукцыі быў наладжаны праз Зэльвенскую і Свіслацкую ярмаркі. Асновай мануфактурнай вытворчасці ў павеце да 1861 г. была дробная вытворчасць з выкарыстаннем прыгонных сялян. Перавага дробнатаварнай вытворчасці сведчыць аб слабым першапачатковым накапленні капіталу і адсутнасці дастатковай колькасці свабодных рук (як па ўсёй Расійскай імперыі). У павеце атрымалі развіццё толькі тыя галіны, якія выкарыстоўвалі мясцовую сыравіну, што часткова прымушала памешчыкаў арыентаваць свае гаспадаркі на вырошчванне спачатку танкарунных авечак, а затым збожжавых культур.



Полесгу

1. Бобровский, П. Материалы для географии и статистики России, собранные офицерами Генерального штаба. Гродненская губерния. В 2 ч. / П. Бобровский. – Ч. 1. – Санкт-Питербург : типография департамента Генерального штаба, 1863. – 866 с.
2. Болбас, М. Ф. Прамысловыя прадпрыемствы дарэвалюцыйнай Беларусі в 1860-1900 гг. / М. Ф. Болбас. – Мінск : выдавецтва БДУ, 1978. – 312 с.
3. Быховцев, Н. И. Волковыщина: 120 лет в Российской империи (1795–1915) / Н. И. Быховцев. – Минск : «Смэлток», 2015. – 805 с.
4. Памяць. Гіст.-дакум. хроніка Ваўкавыскага раёна. — Мінск : БЕЛТА, 2004. – 528 с.
5. Свіслацкі кірмаш [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://biblioteka- . – Дата доступу: 23.05.2017.
6. Соркіна, І. В. Мястэчкі Беларусі ў канцы XVIII – першай палове XIX ст. / І. В. Соркіна. – Вільня : ЕГУ, 2010. – 488 с.
7. Швед, В. В. Торговля в Белоруссии в период кризиса феодализма (1830–1850-е гг.) / В. В. Швед. – Гродно : ПКФ «Орбикс», 1995. – 195 с.
Полесгу